Ва ўрадзе

# ВЫНІКІ ДОБРЫЯ, АЛЕ ТЭНДЭНЦЫІ НАСЦЯРОЖВАЮЦЬ

### Прэзідыум Савета Міністраў абмеркаваў эфектыўнасць рэалізацыі дзяржаўных праграм па выніках пяцігодкі

Па словах **прэм'ер-міністра Беларусі Рамана ГАЛОЎЧАНКІ,** у 2016—2020 гадах рэалізоўвалася 21 дзяржаўная праграма, якая падпадае пад ацэнку, агульны аб'ём фінансавання — Br357 млрд, з іх бюджэтныя сродкі — больш за Br111 млрд.

«Асобныя праграмныя мерапрыемствы, якія фарміруюць паказчыкі якасці жыцця насельніцтва і ўзроўню камфорту, выкананы з добрым вынікам. Напрыклад, забяспечанасць насельніцтва жыллём у разліку на аднаго жыхара павялічана да 28,3 кв. м, створана каля 7,7 тыс. аб'ектаў сацыяльнай і транспартнай інфраструктуры, у тым ліку для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Адрамантавана і рэканструявана амаль 7,5 тыс. км мясцовых аўтамабільных дарог. Згодна з падагульняючай справаздачай, 48 працэнтаў дзяржпраграм аднесены да высокаэфектыўных і эфектыўных, па астатніх эфектыўнасць ацэньваецца як сярэдняя», — цытуе Рамана Галоўчанку БелТА.

Ён адзначыў тэндэнцыю, якая насцярожвае — да канца пяцігодкі знізілася доля высокаэфектыўных праграм, не выканана пятая частка зводных мэтавых паказчыкаў. Асобныя з іх не выконваліся на працягу ўсяго перыяду рэалізацыі дзяржпраграм.

«Гэта суадносіны запазычанасці і выручкі ад рэалізацыі прадукцыі ў сельскай гаспадарцы (праграма «Аграрны бізнес»), удзельная вага валавой дабаўленай вартасці, якая фарміруецца малым і сярэднім бізнесам (праграма «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва»)», — акцэнтаваў увагу прэм'ер-міністр.

У галіне развіцця лічбавай эканомікі не рэалізаваны або не цалкам рэалізаваны праекты электроннага «бальнічнага», сістэм беспапяровага гандлю, аўтаматызацыі адміністрацыйных працэдур, электроннай школы, сістэмы кіравання дзяржфінансамі. Шмат нявыкананых мерапрыемстваў і па дзяржпраграмах «Энергазберажэнне», «Будаўніцтва жылля».

Міністр эканомікі Аляксандр Чарвякоў адзначыў, што высокаэфектыўнымі прызнаныя дзяржпраграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека», «Адукацыя і маладзёжная палітыка», «Беларусь гасцінная».

Акрамя таго, міністр расказаў, якія навацыі плануецца ўкараніць у бягучай пяцігодцы — рэзультатыўнасць дзяржпраграм будуць ацэньваць не толькі на ўзроўні краіны, але і на ўзроўні кожнага рэгіёна. Таксама Міністэрства эканомікі распрацоўвае лічбавую платформу, якая, акрамя маніторынгу выканання дзяржпраграм, будзе ўключаць апытанні насельніцтва.

Прыёмная кампанія — 2021

# РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ І МЕРЫ БЯСПЕКІ

### На што акцэнтуюць увагу падчас цэнтралізаванага тэсціравання

**Да разгляду зваротаў абітурыентаў і іх бацькоў, а таксама да вырашэння магчымых нестандартных сітуацый трэба падыходзіць індывідуальна і максімальна аператыўна. На гэта звярнуў увагу падчас пасяджэння дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступнай кампаніі 2021 года намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**



Фота БелТА.

«Калі падчас паступлення ў абітурыентаў узнікнуць праблемы са здароўем, у іх ёсць магчымасць прыйсці ў рэзервовыя дні. Калі ж і гэтай магчымасці не з'явіцца, то сітуацыю будзем разглядаць у рамках створаных дзяржкамісіяй арганізацыйных механізмаў. Мы стараемся ўсе рашэнні ў рамках існуючых нарматыўна-прававых прадпісанняў прымаць на карысць абітурыента», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Як заўважыў Ігар Петрышэнка, сёлетняя ўступная кампанія, як і леташняя, мае пэўныя асаблівасці, звязаныя з эпідэміялагічнай сітуацыяй: «Мы пастараліся максімальна выключыць для абітурыентаў неабходнасць хадзіць па кабінетах, каб зарэгістравацца на ЦТ. Яны маглі гэта зрабіць у электронным выглядзе. Рэгістрацыю можна было аплаціць праз банкінг у электронным выглядзе, а пасля гэтага ў прызначаны час прыйсці і атрымаць свой пропуск. Гэта дазволіла аптымізаваць многія працэсы і стварыць камфортныя ўмовы для будучых студэнтаў».

Ігар Петрышэнка паведаміў, што на ЦТ зарэгістраваліся ўжо 62,3 тысячы абітурыентаў, прычым большасць маладых людзей прайшлі рэгістрацыю менавіта ў электронным выглядзе. Але тэрміны выдачы абітурыентам пропускаў для ўдзелу ў ЦТ былі працягнуты да 15 чэрвеня.

«Звярніце ўвагу: у пунктах правядзення цэнтралізаванага тэсціравання павінны выконвацца ўсе супрацьэпідэмічныя патрабаванні, арганізуйце дзяжурства медыцынскіх работнікаў. Нельга дапускаць высокую канцэнтрацыю абітурыентаў ні на ўваходзе ў будынкі (на пунктах пропуску), ні перад аўдыторыямі, а таксама пры прыёме дакументаў і правядзенні ўнутраных іспытаў і залічэнні ў студэнты. Меры павінны прымацца на апераджэнне», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Яшчэ адно патрабаванне намесніка прэм'ер-міністра — безумоўнае выкананне мер бяспекі. «Асаблівая ўвага павінна быць удзелена пунктам ЦТ, месцам работы прыёмных і экзаменацыйных камісій, прычым не толькі ў дзень правядзення тэсціравання або іспыту. Таксама трэба быць гатовымі аператыўна рэагаваць на любыя магчымыя правакацыйныя сітуацыі. Нельга дапусціць, каб месцы канцэнтрацыі абітурыентаў былі выкарыстаны для супрацьпраўнай дзейнасці. Лічу, што Міністэрству адукацыі сумесна з МУС неабходна выпрацаваць дадатковыя меры бяспекі», — падкрэсліў ён.

«Асноўная задача дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступнай кампаніі — забеспячэнне для абітурыентаў роўных магчымасцяў для паступлення на аснове наяўных ведаў. Традыцыйна кантроль будзе арганізаваны на трох узроўнях: на ўзроўні дзяржкамісіі, створанай рашэннем кіраўніка дзяржавы, абласных камісій і камісій па кантролі, створаных ва ўстановах адукацыі», — адзначыў **намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Дзмітрый БАСКО.** — Ад КДК у кантролі за ўступнай кампаніяй будуць удзельнічаць 150 вопытных спецыялістаў. Іх асноўная задача — арганізаваць работу на належным узроўні, каб уступныя выпрабаванні прайшлі ў спакойнай і дзелавой атмасферы, а абітурыентам і іх бацькам не было пра што хвалявацца».

Дзмітрый Баско звярнуў увагу абітурыентаў на неабходнасць выканання ўсіх патрабаванняў да правядзення ЦТ: «Гэта ў тым ліку і прапускны рэжым. Шмат выпадкаў, калі забываюць пашпарты ці прыходзяць з копіямі дакументаў. Трэба разумець, што з сабой павінен быць арыгінал дакумента, які сведчыць асобу. Ніякія копіі, нават завераныя натарыяльна, не падыходзяць. Хачу таксама нагадаць, што не варта спрабаваць праносіць у аўдыторыі забароненыя прадметы, паколькі такія абітурыенты могуць быць выдалены з пункта правядзення ЦТ за парушэнне. У мінулым годзе было 14 такіх выпадкаў».

Для правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па краіне будзе адкрыты 41 пункт на базе 31 універсітэта і 10 каледжаў, а ў рэзервовыя дні — па адным у кожным абласным цэнтры і Мінску.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Перспектыва

# Стратэгічны рэгіён

### Напрамкі ўзаемадзеяння акрэслілі падчас Беларуска-азіяцкага форуму

**Супрацоўніцтва з краінамі азіяцкага рэгіёна было і застаецца прыярытэтным напрамкам знешняй палітыкі Беларусі. На гэта звярнуў увагу намеснік міністра замежных спраў Мікалай БАРЫСЕВІЧ падчас Беларуска-азіяцкага форуму, паведаміла БелТА.**

Намеснік кіраўніка беларуская МЗС адзначыў, што ўзаемадзеянне ў азіяцкім напрамку ўзаемавыгаднае і атрымлівае практычны кірунак. Пры гэтым ён падкрэсліў, што Беларусь зацікаўлена ў збалансаваным супрацоўніцтве з рознымі рэгіёнамі свету.

«Гэтым форумам мы працягваем сістэмную і паслядоўную работу на азіяцкім вектары, якую лічылі і лічым вельмі важнай і цікавай. Мы працягнем працаваць далей, развіваючы узаемную цікавасць і ініцыюючы новыя формы кантактаў», — падкрэсліў Мікалай Барысевіч.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі пасольстваў дзяржаў Азіі ў Расіі і ў Беларусі па сумяшчальніцтве. Гаворка пра краіны, якія не маюць сваіх дыпламатычных прадстаўніцтваў у Мінску і дзе няма беларускіх замежных устаноў. Гэта пасольствы, кіраўнікі дыпмісій і іншыя дыпламаты Інданезіі, Емена, Камбоджы, Малайзіі, Шры-Ланкі, М'янмы, Непала, Сінгапура, Тайланда, Афганістана, Лаоса, Філіпін.

Крыху больш за тыдзень таму ў Мінску прайшло падобнае мерапрыемства — другі Беларуска-афрыканскі эканамічны форум. На думку намесніка міністра, сустрэча з афрыканскімі партнёрамі была паспяховая і своечасовая. «Гэта дазволіла атрымаць дадатковую інфармацыю, экспертызу па спосабах далейшага развіцця і ўмацавання супрацоўніцтва ў розных галінах. І ў першую чаргу ў эканоміцы і гандлі», — адзначыў намеснік міністра.

Кажучы пра развіццё адносін з Азіяцкім рэгіёнам, беларускі дыпламат падкрэсліў, што наша краіна дасягнула стратэгічнага партнёрства з Кітаем, падтрымлівае канструктыўны дыялог з Пакістанам, Індыяй, В'етнамам. «Наш падыход вельмі просты: чым больш развіваецца супрацоўніцтва, чым больш трывалы дыялог, тым лепш для нас. І гэта пацвярджалася на многіх прыкладах, шматлікімі падзеямі і сітуацыямі, — канстатаваў Мікалай Барысевіч. — У нас не існуе ніякіх палітычных праблем у двухбаковым парадку і падыходы па асноўных міжнародных пытаннях досыць падобныя. Гэта стварае добрую аснову для развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва як галоўнага напрамку двухбаковага ўзаемадзеяння».

Мікалай Барысевіч таксама звярнуў увагу: «Беларускі экспарт за мінулы год склаў каля $2 млрд. У параўнанні з папярэднім перыядам ён узрос, так што тэндэнцыі да росту і перспектывы таксама маюцца». Намеснік міністра заўважыў, што эканомікі Беларусі і азіяцкіх краін узаемна дапаўняюць адна адну: беларуская прадукцыя запатрабаваная ў Азіі, таксама як і тавары з гэтага рэгіёна запатрабаваныя ў Беларусі. «Мы ўжо неаднаразова канкрэтнымі справамі даказвалі, што Беларусь — надзейны партнёр, і працягнем гэта рабіць у будучыні», — падкрэсліў дыпламат.

# ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ АЖЫВАЕ

### Інтэрактыўны выставачны праект «Партызаны Беларусі» ўпершыню прэзентавалі ў Гомелі

**Экспазіцыя прадстаўлена ў Гомельскім дзяржуніверсітэце імя Ф. Скарыны.**

У аснове выставы — гістарычныя фатаграфіі часоў Вялікай Айчыннай вайны, копіі ўзнагародных лістоў і баявых характарыстык партызан і падпольшчыкаў. Праект распавядае аб подзвігах і заслугах канкрэтных партызан, дзейнасці партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гадах. У экспазіцыі інтэрактыўнай выставы — матэрыялы Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў. Таксама ёсць дакументы ўнікальнага інтэрнэт-праекта выдавецкага дома «Беларусь сегодня» і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь «Партызаны Беларусі». Летась праект прэзентавалі ў Брэсце, Магілёве, Гродне і Маладзечне. З улікам цікавасці з боку наведвальнікаў было прынята рашэнне абнавіць фармат экспазіцыі і паказаць яе ў іншых гарадах. Цяпер мэтавая аўдыторыя — студэнты і выкладчыкі ВНУ.

— За гэтай выставай — скрупулёзная адказная работа: з архіўнымі дакументамі, якія ні ў якім разе нельга пашкодзіць, з фактамі, якія нельга сказіць, з гісторыяй, якую недапушчальна перапісаць, — звярнуў увагу падчас адкрыцця праекта «Партызаны Беларусі» **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** Кіраўнік рэгіёна зазначыў, што на сёння ў інтэрнэце праект паглядзелі больш за 220 тысяч чалавек, а гэта сведчыць, што праведзеная работа не была дарэмнай.

— Усё далей і далей ад нас гады Вялікай Айчыннай вайны і пераможны салют 1945-га. І ўсё настойлівей спробы Захаду перапісаць гісторыю. Але мы супрацьстаім гэтаму. Мы дакладна захоўваем гістарычную праўду. Не на словах, а на справе, — звярнуўся да прысутных Генадзь Салавей. — У 2019 годзе ветэран вайны Іван Дзмітрыевіч Кандрусевіч папрасіў мяне адкрыць у Гомельскай вобласці помнік партызанам. У гэты ж годзе ў Гомелі былі ўстаноўлены помнік братам Лізюковым, сярод якіх кіраўнік партызанскага руху ў Мінскай вобласці Яўген Лізюкоў. Ужо ў наступным годзе да гадавіны Вялікай Перамогі на сцяне шматпавярховага дома стварылі саракаметровы партрэт Героя Савецкага Саюза партызанскага камандзіра Емяльяна Барыкіна. Сёлета аднаўляем мемарыял «Партызанская крынічка» ў Гомельскім раёне, — падкрэсліў губернатар. Па яго словах, гістарычны праект «Партызаны Беларусі» — грунтоўны ўнёсак у захаванне агульнай гісторыі, у патрыятычнае выхаванне маладога пакалення. Невыпадкова на Гомельшчыне выставу ў першую чаргу пагладзяць студэнты — інтэлектуальная эліта.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**